**PR – рэпартаж «Я ў глыбіню вякоў з хваляваннем гляджу»**

**Карэспандэнт 1:**
Добры дзень, паважаныя сябры! Мы вядзём свой рэпартаж з джяржаўнай установы адукацыі “Азерская сярэдняя школа”. Факты, аб якіх мы вам раскажам, - гэта гісторыя Гродзенскага раёна, дзе нам з вамі пасчаслівілася жыць. Нажаль, аб гэтых фактах не напісана ў падручніках па гісторыі, і таму мала хто пра іх ведае. Але мы павінны ведаць, бо гэта наша малая радзіма, тым больш, што 2022 год у нашай краіне аб’яўлены Годам гістарычнай памяці. З гэтай мэтай мы і адправіліся ў экспедыцыю.

Аб чым мы даведаліся? – раскажуць нашы карэспандэнты – удзельнікі экспедыцыі, члены ГА “БРСМ” Азерскай сярэдняй школы.

**Карэспандэнт 2:**
Пачнем мы свой аповяд не з гісторыі, а з сучаснасці. Але і мінуламу абявязкова будзе месца ў нашым рэпартажы.

**Карэспандэнт 3:**
Калі мы ступілі на тэрыторыю маёнтка Свяцка Гурскіх, што на тэрыторыі Гродзенскага раёна, - адразу зразумеелі: тут ёсць жыццё. Журчыць вада, якая паступова пераліваецца з аднаго возера ў другое, і стварае цэлую незвычайна цудоўную водную сістэму, якая прадстаўляе каскад азёр. У паркавай зоне адкрыты старынныя алеі з векавымі дрэвамі. А вечарамі ў вокнах гарыць святло. Прыязджаюць госці.

**Карэспандэнт 4:**
Як вы думаеце, аб чым гэта сведчыць? Сапраўды, мы ўбачылі вынік складанай і затратнай работы. Зараз мы вас пазнаёмім з чалавекам, які аднавіў маёнтак.



**Карэспандэнт 6:**
Віктар Уладзіслававіч Барташэвіч. З 2011 года ён з’яўляецца ўладальнікам маёнтка і працуе над яго развіццём.

**Карэспандэнт 1:**
Але звернемся да гісторыі. Што такое Свяцк Гурскіх?



*Захаваўся адзіны здымак палаца, які нам удалося знайсці.*



**Карэспандэнт 2:**

Менавіта з Гурскімі звязана працвітанне Свяцка і бліжэйшых ваколіц. Воляй лёсу Юзаф Гурскі аказаўся найбуйнейшым землеўласнікам Аўгустоўскай губерні. Ён ўдала выкарыстаў свае магчымасці. У 1873 г. ён з дапамогай сваяка, будаўнічага па прозвішчы Пранашка, пабудаваў вялікі палац з рамантычнымі і мадэрністычнымі паркамі, агародамі і сажалкамі, якія ўтвараюць цудоўны каскад.

**Карэспандэнт 3:**

Звярніце ўвагу на партрэт. Гэта Пётр Гурскі – сын Юзафа Гурскага, нарадзіўся ў 1859 годзе. Выпускнік Львоўскай палітэхнікі, ён стаў апошнім уладальнікам Свяцка Гурскіх.

Пётр працягнуў справу бацькі і стварыў у ваколіцах Сапоцкіна крухмальны завод, малачарню з паравым рухавіком і некалькі іншых даволі вялікіх прадпрыемстваў, якія працавалі аж да пачатку 21 стагоддзя. *На здымку вы бачыце крухмальны завод.*



**Карэспандэнт 4:**

Аднавіўшы падупалую ў часе вайны гаспадарку, ён пераўтварыў Свяцк у санаторый. Як узгадвае гісторык Святлана Куль, з мая па кастрычнік Свяцк Гурскіх прымаў адпачываючых. Тут гулялі ў тэніс, каталіся на брычках, палявалі на качак, каталіся па Аўгустоўскім канале на лодках. У палацы былі 12 пакояў, каналізацыя, ванныя…. Каштаваў адпачынак ад 2 да 4 злотых за суткі.

**Карэспандэнт 5.**Трэба дадаць, што Петр Гурскі  фінансава падтрымліваў



некалькі навучальных установаў у губерні, пабудаваў у Сапоцкіне драўляны касцёл ( на здымку).

**Карэспандэнт 6.**

Звярніце ўвагу: пры жыцці ён карыстаўся вялікай любоўю мясцовых сялян, якія нават аплаквалі яго на пахаванні. У ваколіцах адноўленага палаца дасюль стаіць непрацуючы даўно крухмальны завод, а ў дамах, збудаваных Пятром Гурскім, жывуць дзясяткі жыхароў Радзівілак.

**Карэспандэнт 1:**

Зараз мы звяртаемся да моладзі  з высновай, што Палаца – паркавы ансамбль Свяцк Гурскіх ў вёсцы Радзівілкі Гродзенскага раёна ўвайшоў у дасье як памятнік прыроды і гісторыі. Гэта наша малая радзіма, якой мы можам ганарыцца.

**Карэспандэнт 2.**

Выдатна, што Сядзібу Свяцк Гурскіх у вёсцы Радзівілкі ля Аўгустоўскага канала ўрачыста адкрылі пасля рэканструкцыі 26 жніўня 2020 года.





У мерапрыемстве ўзялі ўдзел сын апошняга ўладальніка маёнтка Юзафа Гурскага - 90-гадовы Ежы (у цэнтры), а таксама яго нашчадкі.



**Карэспандэнт 3:**
На сённяшні дзень зберагласся і ўсыпальніца Гурскіх, якую пабудаваў Пётр у 1873 годзе на могілках у Сапоцкіне. Віктар Барташэвіч таксама паклапаціўся аб яе аднаўленні.



Думаю, паважаныя сябры, што нам з вамі вельмі прыемна, што і сёння ёсць людзі, якія клапоцяцца не толькі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці, але і аб памяці нашых продкаў, зберагаюць усе для



патомкаў.

**Карэспандэнт 4:**
І перш, чым развітацца, мы разам з Віктарам Барташэвічам запрашаем усіх на экскурсію ў Палац Гурскіх, каб пераканацца, што нам ёсць чым ганарыцца, і не толькі захаваць у сэрцы любоў да малой радзімы, але і перадаць яе новым пакаленням.

Даследаванні правялі і рэпартаж
падрыхтавалі члены ГА "БРСМ"
Азерскай сярэдняй школы